# Лукашэнка ў Пасланні народу і парламенту: мы сёння моцна трымаем у руках будучыню нашай незалежнай Беларусі

Народ Беларусі сёння моцна трымае ў руках будучыню сваёй незалежнай краіны. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў сёння ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, перадае карэспандэнт БЕЛТА.
“Мільёны здзіўленых і зацікаўленых вачэй народаў Узбекістана і Таджыкістана, Казахстана і Туркменістана, Каўказа, братэрскіх нам Расіі і Украіны сапраўды ў гэтыя дні накіраваны на нашу Радзіму, шматпакутную Беларусь. У іх позірках адно пытанне: “Ці вытрымае Беларусь? Ці зможа выстаяць у гэтай гібрыднай схватцы, у гэтай вайне? Яны разумеюць: калі беларусы рухнуць, наступнымі будуць яны”, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сёння супраць яго накіраваны ўсе ядавітыя “кавідныя” стрэлы: зваліць, унізіць, растаптаць, знішчыць. “Дык вось ведайце, нават без мяне беларускі народ зможа сябе абараніць. Таму што ведае, што іншай зямлі ў свеце, акрамя Беларусі, у яго не будзе. Нідзе — ні ў Аўстраліі, ні ў Штутгарце — ім месца няма. У афшорах грошай таксама няма. А ў лапці абуць народ вам (дэструктыўным сілам. — Заўвага БЕЛТА) не ўдасца і пад бізун загнаць ужо не атрымаецца, — заявіў Прэзідэнт. — І помніце, у нас ёсць і міліцыя, і армія, і спецслужбы. Гэта дзеці тых, каго вы хочаце запрэгчы ў калёсы і паганяць пугай. Яны — людзі ў пагонах — вам гэтага зрабіць не дазволяць. Нават без мяне. Вы спазніліся роўна на чвэрць стагоддзя”.

“Мы сёння моцна трымаем у руках будучыню. Будучыню нашай незалежнай Беларусі. Краіну мы вам не аддадзім. Незалежнасць каштуе дорага. Але яна вартая таго, каб яе захаваць і перадаць

будучым пакаленням. За намі Беларусь – чыстая і светлая, сумленная і прыгожая, працавітая, крыху наіўная і крыху ранімая. Але яна – наша, яна любімая. А любімую не аддаюць”, – рэзюмаваў беларускі лідар.

БЕЛТА